*Людміла Качарагіна*

**ФАРМІРАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ ВУЧНЯЎ ВЫХАВАЎЧЫМІ СРОДКАМІ МАСАВАГА НАРОДНАГА СВЯТА**

Адным з асноўных напрамкаў дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі ў адпаведнасці з Кодэксам аб адукацыі і Праграмай неперарыўнага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца фарміраванне сацыяльна-духоўнай і маральна сталай творчай асобы і выкарыстанне выхаваўчага патэнцыялу каляндарна-абрадавага цыкла беларускага народа [8, С. 3]. Адзін з выхаваўчых сродкаў, які дазваляе з'яднаць нацыянальныя і дзяржаўныя інтарэсы дзяцей, - народныя святы і абрады. Вось чаму я звярнулася да народных святаў, абрадаў і традыцый як да сродка living рознабаковага выхавання вучняў, які фарміруе свабодную, духоўную і творчую асобу.

У 1988 годзе пры Палатоўскай сярэдняй школе быў створаны клуб «Спадчына», які ставіў сваёй асноўнай задачай адраджэнне традыцый і абрадаў Палатоўскага краю.

Дата нараджэння клуба - 1 кастрычніка 1988г. Першымі членамі яго сталі вучні 7 - 10 класаў у колькасці 20 чалавек. Былі створаны 3 групы: фальклорная, група адраджэння абрадаў і група пошуку. Фальклорная група запісвала абрадавыя песні, вяла пашпартызацыю, развучвала іх і спявала. Група адраджэння абрадаў запісвала ад старажылаў абрады, дапамагала ствараць сцэнарыі для пастаноўкі на сцэне і выступала з паказам перад вучнямі і аднавяскоўцамі.

З кожным годам пашыралася тэматыка дзейнасці клуба «Спадчына». Запісаны на вясельныя, калядныя, жніўныя, любоўныя песні, прыпеўкі. Афармлены запісы песень у альбомах. Складзены дыялектны слоўнік гаворкі Палатоўскага сельсавета, запісаны народныя прыметы, мянушкі жыхароў Палаты, калыханкі. Адрадзілі абрады земляробчага календара: «Каляды», калядную гульню «Жаніцьба Цярэшкі», Масленіца, Гуканне вясны, Вялікдзень, Валачобнікі, Дажынкі, Багач; сямейна-бытавыя абрады: Заручыны, Каравай, Вяселле і г.д. Выступалі не толькі на школьнай сцэне, але сваімі выступленнямі радавалі вяскоўцаў Палатоўскага сельсавета. Члены клуба «Спадчына» сталі ўдзельнікамі розных конкурсаў і фестываляў. Прыйшоў і першы поспех.

Адначасова збіраліся прадметы побыту, якія пазней сталі экспанатамі музея сялянскай хаты. На аснове сабраных экспанатаў і матэрыялаў быў створаны музей каляндарна-абрадавых традыцый. Урачыста музей быў адкрыты 6 сакавіка 2001 года. На адкрыцці прысутнічалі прадстаўнікі раённай улады, супрацоўнікі Полацкага Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, А.Ю.Лозка, дацэнт Белдзяржуніверсітэта імя М.Танка і іншыя госці. У 2001 годзе музей каляндарна-абрадавых традыцый стаў лаўрэатам на рэспубліканскім конкурсе на лепшы музей. а ў 2010 годзе ў рамках акцыі «Жыву ў Беларусі і тым ганарусь» атрымаў дыплом І ступені на лепшы этнаграфічны музей. Роля музея каляндарна-абрадавых традыцый заключаецца ў тым, каб на гісторыі, традыцыях і этнаграфічным матэрыяле Палатоўскага краю і з дапамогай сімвалаў паказаць каляндарныя святы і абрады. Кожнай пары года адпавядалі магічна-ахоўныя абрады, рытуалы, звычаі, песні, варажба, прыкметы, гульні. Музей пагэтаму і стаў пляцоўкай, дзе праводзяцца святы каляндарнага года. На адкрытай пляцоўцы праводзяцца святы Масленіца, Сёмуха, Купалле, на якім прысутнічаюць не толькі вучні, але і мясцовае насельніцтва, госці. Праводзяцца святы і на школьнай сцэне, бо не ўсе патрабуюць вялікіх пляцовак і вялікай колькасці ўдзельнікаў і гледачоў.

Матэрыялы музея даюць магчымасць заняцца даследчай работай для патрэбы стварэння сцэнарыяў правядзення святаў і абрадаў. Сімвалічная роля экспанатаў музея дазваляе карыстацца ў час правядзення пэўныхпрадстаўленняў. Актыўнымі ўдзельнікамі такіх прадстаўленняў з'яўляюцца краязнаўчы клуб «Спадчына», музей каляндарна-абрадавых традыцый і ўзорны фальклорны гурт «Знічка», лаўрэат многіх конкурсаў ( кіраўнік Захарэўская Л.М.). Актывісты і члены краязнаўчага клуба і музея каляндарна-абрадавых традыцый разам з кіраўнікамі гурткоў займаюцца зборам і апрацоўкай сабраных у час экспедыцый фальклорных матэрыялаў. Затым ствараецца рабочая група па правядзенню пэўнага свята ці абрада. Складаецца план падрыхтоўкі, які абавязкова абмяркоўваецца, улічваючы меркаванні ўсіх бакоў, вызначаюцца адказныя за пэўныя ўчасткі работы, вызначаецца тэрмін правядзення. Да гэтага ўдзелу запрашаем мясцовых старажылаў, якія могуць даць удакладненні і рэкамендацыі па правядзенню свята. Аказваюць пасільную дапамогу бацьку пры афармленні сцэны ці пляцоўкі. Праводзім і анкетаванне сярод вучняў школы і іх бацькоў. Сваімі шчырымі адказамі яны дапамагаюць лепш падрыхтавацца да правядзення свята.

Адказны кіраўнік і члены рабочай групы распрацоўваюць прыкладны змест сцэнарыя, падбіраюць патрэбны рэквізіт, прадстаўляюць эскізы афармлення сцэны або пляцоўкі, а таксама і запрашальных білетаў. Да гэтай работы далучаюцца настаўнік спеваў, музычныя і танцавальныя кіраўнікі. Тут кожны стараецца паказаць свае творчыя здольнасці. Мэта такога планавання - выразна сфармуляваць галоўныя задачы задуманага мерапрыемства, прадугледзець усё неабходнае для паспяховага яго правядзення, правільна размеркаваць сілы і час на падрыхтоўку, дамагчыся выразнасці і зладжанасці ў дзеяннях усіх удзельнікаў. Абавязкова праводзім кансультацыі з супрацоўнікамі раённага Дома культуры, якія займаюцца пытаннямі правядзення масавых і тэатралізаваных святаў.

Абмяркоўваем мы і тое, што цікавага чакае гледачоў на свяце, якія сюрпрызы яны ўбачаць, у якія гульні будуць гуляць, якія карагоды будуць вадзіць, якія танцы таньчыць, што будуць спяваць. Цікавая

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гульнёвая праграма, канцэрт, калі іх рыхтуюць самі дзеці разам з бацькамі, настаўнікамі, будзе імі прынята з захапленнем, бо з цягам часу ў нашым калектыве, як правіла, становіцца добрай традыцыяй. Вызначаюцца выканаўцы галоўных роляў свята. А гэтую адказную місію выконвае ўзорны фальклорны гурт «Знічка». Шмат гадоў яны радуюць гледачоў сваімі канцэртнымі праграмамі гледачоў не толькі на школьнай і клубнай сцэне. Іх выступленні бачылі гледачы Полацка, Наваполацка і Віцебска, Гомеля і Мінска – і ўсюды яны жаданыя госці. Праводзяцца рэпетыцыі. Завучваюцца ролі, ансамбль музыкантаў рэпетуе музычнае суправаджэнне: спевы, танцы, свае сольныя нумары вакальны фальклорны гурт развучвае песні, танцавальная група рыхтуе народныя танцы. Вядома, дзяцей у школе нямнога, таму многім прыходзіцца ўдзельнічаць у розных групах.

Рэпетыцыі скончаны. Апошні «прагон». Падрыхтавана сцэна ці пляцоўка, афармлены сімваламі згодна пэўнамі святу ці абраду. Падрыхтаваны касцюмы. Фальклорны гурт «Знічка» апранаецца ў нацыянальныя строі, у дзяўчат на галаве вяночкі, у хлопцаў – капалюшы. На кожным свяце абавязкова прысутнічаюць бацькі, госці. Крыху хвалявання – і яны ўжо на сцэне: вясёлыя, задорныя, прыгожа рухаюцца, спяваюць, танцуюць, гуляюць у гульні, жартуюць. І самае галоўнае: яны шчаслівыя, бо нясуць святочны настрой гледачам, нясуць часцінку нашай спадчыны ў народ. Пасля выступлення абавязкова збіраецца рабочая група і абмяркоўваецца праведзенае свята. Абмеркаванне сумеснай, важнай справы – заключны акорд свята. Вызначаем, што ўдалося ў правядзенні мерапрыемства, звяртаецца ўвага на выяўленыя недахопы, па якой прычыне гэта стала. Гэтыя недахопы ўлічваюцца пры правядзенні іншых мерапрыемстваў.

Накоплены вопыт работы з вучнямі, сабраны і апрабіраваны матэрыял дазваляюць праводзіць святы і абрады з рознай колькасцю дзяцей, у памяшканні і на пляцоўцы. Галоўнае назначэнне святаў – прынесці гледачам і слухачам радасць. Любое свята праходзіць паспяхова толькі ў тым выпадку, калі яму папярэднічае вялікая падрыхтоўчая работа, у якую прыцягваецца як мага болей яго ўдзельнікаў. Ужо сам працэс падрыхтоўкі да свята, шырокае яго рэкламаванне загадзя ствараюць неабходны настрой. Для гэтага патрэбна выклікаць інтарэс у кожнага ўдзельніка для таго, каб кожны сам стаў удзельнікам. Ад простага назірання яны самі стануць яго ўдзельнікам. Арганізацыя свята патрабуе прадуманых слоў і ўчынкаў, бо яны паказчыкі нашай педагагічнай культуры, душэўнага такту, цярпення, якія склаліся ў рабоце з дзецьмі.

Галоўная мэта працы педагагічнага калектыву ўстановы ўдадзеным накірунку – спрыяць фарміраванню ў бацькоў пазітыўных адносін да правядзення народных святаў і абрадаў, пабуджаць іх дапамагаць дзецям актыўна ўдзельнічаць у дадзеных мерапрыемствах. Адносіны баць коў да народных святаў і абрадаў могуць з'яўляцца пераканаўчым прыкладам і сродкам выхавання ў дзяцей паважлівых адносін да культурных традыцый нашай краіны.

Асноўная ідэя канцэпцыі беларусазнаўства на сучасным этапе заключаецца ў рашучым абнаўленні зместу навучання і выхавання, надання ўсёй сістэме адукацыі нацыянальнай асновы. Надзвычай важна, каб чалавек ужо змалку адчуваў і ўсведамляў сябе носьбітам культурнай спадчыны і традыцый, якія складваліся ў той ці іншай мясцовасці на працягу стагоддзяў. У рабоце з дзецьмі важнае месца належыць фальклору – галоўнаму мастацкаму багаццю нашых продкаў, дзякуючы якому захоўваецца пераемнасць традыцый, ажыццяўляецца сувязь пакаленняў і бесперапыннасць духоўнага развіцця нацыі. Школьны музей каляндарна-абрадавых традыцый, краязнаўчы клуб «Спадчына», фальклорны гурт «Знічка» як цэнтр нацыянальнага выхавання ў наш час набывае актуальнасць. Эфектыўнымі сродкамі, формамі і метадамі выхаваўчай работы, накіраваных на развіццё нацыянальных каштоўнасцей дзяцей і моладзі, – паказаць багацце традыцый нашага народа, даць звесткі аб народных святах і абрадах, абудзіць пачуццё прыналежнасці да беларускага народа.

**Спіс літаратуры:**


1. Ад верасня да жніўня / рэд.-укл. Л.І. Жук. – Мінск : ТАА «Красіка-Прынт», 2001. – 128 с.
2. Аляхновіч, А.М., Рахчэўскі М.В., Фядосік А.С. Беларускі дзіцячы фальклор / А.М. Аляхновіч, М.В. Рахчэўскі, А.С. Фядосік. – Мінск : Беларусь, 1994. – 272 с.
3. Бандарчык, В., Бялявіна В. [і інш.]. Святы і абрады ў Беларускай ССР / В. Бандарчык, В. Бялявіна. – Мінск : Полымя,1988. – С. 300.
4. Беларускі народны каляндар / аўт.-уклад. А. Лозка. – Мінск : Полымя, 1993. – 205 с.
5. Варанецкая, Л.М. Выхоўваем грамадзяніна / Л.М. Варанецкая, К.М. Бельская, І.Л. Ждан. – Мінск : Зорны верасень, 2008. – С. 132.
6. Крук, І. Следам за сонцам. Беларускі народны каляндар / І.І. Крук. – Мінск : Ураджай, 1998. – 215 с.
7. Лозка, А. Гульні, забавы, ігрышчы / А. Лозка. – Мінск : Беларус. навука, 2000. – 590 с.
8. Праграмы неперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь на 2011-2015 гады ад 24 мая 2011 г. № 16
9. Стральцоў, Ф.А. Методыка выхаваўчай работы ў клубе / Ф.А. Стральцоў. – Мінск : Просвещение, 1979. – С. 224.
10. Шаламіцкая, Т. Карагод круглы год / Т. Шалміцкая. – Мазыр : Белы вецер, 2001. – 42 с.
11. Цыральчук, А.А. Купалінка: народныя святы і абрады / А.А. Цыральчук. – Мазыр : ТАА ВД «Белы вецер». – 2005. – С. 45-47.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ